# ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

7 сакавіка ў нашым універсітэце адбылася VI справаздачна-выбарчая канферэнцыя пярвічнай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава» з правамі раённага камітэта.

На парадку дня было пяць пытанняў. Выконваючы абавязкі першага сакратара Уладзіслаў Цітоў расказаў пра дзейнасць БРСМ нашай ВНУ, а таксама пра выбранне камітэта, кантрольнай камісіі і дэлегатаў на XXXV справаздачна-выбарчую канферэнцыю Першамайскай раённай арганізацыі ГА «БРСМ» горада Віцебска.

Акрамя таго, быў прыняты зварот дэлегатаў да студэнтаў нашага ўніверсітэта, у якім зазначалася, што БРСМ – гэта грамадская маладзёжная арганізацыя, асноўная мэта якой – стварыць умовы для ўсебаковага развіцця моладзі і раскрыцця яе творчага патэнцыялу. Саюз моладзі зарэкамендаваў сябе канкрэтнымі справамі і заваяваў аўтарытэт не толькі ў асяродку студэнтаў, але і ў грамадстве ў цэлым.

Падчас канферэнцыі былі выбраны камітэт з 11 чалавек, кантрольная камісія ў складзе 3 чалавек і 36 дэлегатаў, якія будуць прадстаўляць БРСМ нашага ўніверсітэта на раённай канферэнцыі.

***

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў (Віцебская-Горкаўская выбарчая акруга) Таццяна Старынская напрыканцы лютага стала госцем факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі. Таццяна Аляксандраўна сустрэлася з прафесарска-выкладчыцкім складам кафедр практычнай псіхалогіі і сацыяльна-педагагічнай работы. У размове з выкладчыкамі факультэта дэпутат расказала пра змены ў пенсійнай рэформе Беларусі і прывяла прыклады з рэальнай практыкі выкарыстання некаторых норм пенсійнага заканадаўства. Таццяна Старынская папрысутнічала таксама на цырымоніі ўручэння выпускнікам дыпломаў аб вышэйшай адукацыі і павіншавала іх з гэтым святочным днём.

***

Напрыканцы лютага на факультэце сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі адбылося ўзнагароджанне ўдзельнікаў валанцёрскага адукацыйнага праекта «Дзеці ў Інтэрнэце», што быў арганізаваны кампаніяй «МТС» пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Нашыя хлопцы і дзяўчаты за лістапад – снежань правялі ўрокі мабільнай граматнасці ў 43 класах школ Першамайскага раёна горада Віцебска. Прамежкавыя вынікі падвёў дырэктар Віцебскага філіяла МТС У.У. Андрэйчанка, які ўручыў 39 сертыфікатаў удзельнікам-валанцёрам ФСПіП. А студэнткі 5 курса Анастасія Малахава і Наталля Тараканава атрымалі за актыўны ўдзел і крэатыўны падыход ад кампаніі каштоўныя прызы.

***

Спартландыя «А ну-ка, парни!» прайшла ў нашым універсітэце ў Дзень абаронцаў Айчыны. У спаборніцтве прынялі ўдзел хлопцы, якія пражываюць у інтэрнатах № 3, № 4 і № 5. Арганізавалі і правялі спартландыю інструктары спартыўнага клуба нашага ўніверсітэта (кіраўнік Алег Галавінец): Ганна Шарстнёва, Андрэй Серабракоў, Пётр Яско і Аляксандр Батуркін. У выніку напружанай барацьбы першае месца занялі студэнты з Туркменістана, якія пражываюць у інтэрнаце № 4, другое – студэнты-туркмены з інтэрната № 5, трэцімі сталі беларускія хлопцы з інтэрната № 3.

***

Каманда туркменскіх хлопцаў нашага ўніверсітэта годна выступіла на турніры па валейболе сярод туркменскіх студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь, што праходзіў у сярэдзіне лютага на базе Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта. У турніры прынялі ўдзел студэнты з Мінска, Віцебска, Гродна, Гомеля і іншых гарадоў. А перамогу святкавалі туркменскія студэнты ВДУ імя П.М. Машэрава.